

# ПУБЛІЦЫСТЫКА

*Да 100-годдзя А.Я.Макаёнка і 50-годдзя з дня напісання трагікамедыі "Трыбунал"*

## "МЯНЕ ДОЎГІ ЧАС СТРЫМЛІВАЛА ПРАБЛЕМА ЖАНРУ..."

У 2020 годзе спаўняецца 50 гадоў з дня першай публікацыі трагікамедыі Андрэя Ягоравіча Макаёнка «Трыбунал».

Андрэй Ягоравіч Макаёнак – народны пісьменнік Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы, ураджэнец в. Борхаў Рагачоўскага раёна.

З імем Андрэя Ягоравіча Макаёнка звязана адна з самых яркіх старонак беларускай драматургіі. Яго п'есы ўвайшлі ў склад залатога фонду беларускай літаратуры, сталі асновай рэпертуару многіх тэатраў другой паловы мінулага стагоддзя.

Іван Пятровіч Шамякін у адным са сваіх артыкулаў пісаў: "У тэатральным сезоне 1972/73 года на афішах Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы стаялі чатыры назвы спектакляў, пастаўленых па п'есах Андрэя Макаёнка: "Лявоніха на арбіце", "Зацюканы апостал", "Трыбунал", "Таблетку пад язык". ...Такі факт – з'ява надзвычай рэдкая ў гісторыі сцэнічнага мастацтва".

У Мемарыяльнай зале Андрэя Макаёнка, якая створана ў Гомельскай абласной бібліятэцы, захоўваецца першы варыянт рукапісу п'есы "Трыбунал", дзе пазначана дата: 6. IV – 1969 г. – 8. IV – 1969 г., Ждановічы. Упершыню п'еса была надрукавана ў газеце "Звязда" ў верасні 1970, а потым у часопісе "Полымя" (1970, № 10).

У творчай біяграфіі Андрэя Макаёнка п'еса "Трыбунал"займае асаблівае месца. Для яго Вялікая Айчынная вайна – перажытая трагедыя. Фашысты забілі бацьку, Ягора Сяргеевіча, за сувязь з партызанамі. Партызанамі былі ягоныя брат з сястрой. Ваяваў сам пісьменнік і быў цяжка паранены. 13 аскепкаў нямецкай міны ўсё сваё жыццё ён пранасіў у абедзвюх ступнях ног. Таму напісаць пра акупацыю, падполле, партызанскі рух драматург лічыў сваім абавязкам, пісьменніцкім і грамадзянскім. Але як пра гэта напісаць камедыю?

Сам Макаёнак пра гісторыю стварэння п'есы "Трыбунал" расказваў наступнае: "Мяне доўга стрымлівала праблема жанру. Хацелася захаваць у п'есе гераічны, суровы пафас Вялікай Айчыннай вайны і адначасова застацца верным камедыйнаму жанру. Не здраджваць яму. Доўга не знаходзіў матэрыялу для сюжэта. ... Аднойчы прыйшоў на памяць эпізод ваеннага часу. Беларускія партызаны ў адной вёсцы ў час акупацыі вырашылі паставіць

старастам свайго чалавека – патрэбна была сувязь з падполлем райцэнтра. Знайшлі старога, да якога адносіліся з даверам. Угаварылі. Укаранілі… А праз двое сутак з’яўляецца ён да партызан і просіць: “Браткі, больш туды не пайду. Збілі мяне дома жонка і дачка. Прымушаюць ісці і адмовіцца ад пасады”.

Выпадак гэты ўспомніўся мне таму, што там быў элемент гумару: новаспечанага старасту свае ж, родныя, жонка і дзеці, збілі, а стары не мог адкрыць свайго задання, таму што справа патрабавала строгай канспірацыі. Але ў гэтай жа сітуацыі закладзены і трагічны пачатак: сумленны чалавек можа загінуць ад рук сваіх жа грамадзян, якія не ведаюць тайну, ён рызыкуе жыццём. Так нарадзіўся сюжэт трагікамедыі “Трыбунал”. Пазней драматург успамінаў, што п’еса начарна была напісана ў рэкордна кароткі тэрмін – за трое сутак: “Хацеў запісаць гэты эпізод для памяці, а прапрацаваў да раніцы”.

Потым вядома былі многія ўдакладненні і папраўкі, аднак яны датычыліся нейкіх нязначных момантаў.

Даволі рызыкоўным эксперыментам была спроба пісьменніка ўвасобіць тэму гераізму савецкіх людзей у час Вялікай Айчыннай вайны ў жанры трагікамедыі. У тагачаснай драматургіі такіх выпадкаў не наглядалася. А ўсе непрывычнае, як правіла, прымаецца не адразу. Так адбылося і з “Трыбуналам”.

П’еса спачатку была сустрэта надзіва холадна. Прайшло нямала часу, пакуль знайшоўся рэжысёр, які рызыкнуў яе паставіць. Да беларускага гледача “Трыбунал” ішоў праз Маскву. Прэм’ера адбылася ў Маскоўскім тэатры на Малой Броннай. Спектакль быў пастаўлены рэжысёрам Аляксандрам Дунаевым сумесна з акцёрам і рэжысёрам-пастаноўшчыкам Львом Дуравым. Галоўную ролю Цярэшкі Калабка выконваў Леў Дураў. Крытыка аднесла спектакль да сур’ёзных творчых удач сезона.

Поспех прэм’ерных спектакляў у Маскве садзейнічаў павышэнню цікавасці да “Трыбунала”.












У выніку, за невялікі тэрмін п'есу ўключылі ў свой рэпертуар звыш 160 прафесійных і многія самадзейныя тэатры.

У архіве Андрэя Макаёнка захаваўся дакумент, які сведчыць, што за 4 гады (1977-1980 г.г.) п'еса "Трыбунал" была пастаўлена 186 разоў.

З вялікім поспехам прайшла прэм'ера "Трыбунала" ў тэатры імя Янкі Купалы. Спектакль паставіў рэжысёр Валерый Раеўскі. Галоўныя ролі выканалі вядомыя беларускія акцёры Галіна Макарава і Генадзь Аўсяннікаў. Спектакль карыстаўся вялікім поспехам. І ў рэпертуары Купалаўскага тэатра "Трыбунал" затрымаўся больш як на 20 гадоў. А легендарны дуэт Аўсяннікава і Макаравай цытавалі ўсе сталічныя пляцоўкі таго дня.

Сустрэўся з драматургіяй Макаёнка і польскі глядач. Адбылося гэта ў 1973 годзе, калі рэжысёр Збігнеў Бесерта паставіў "Трыбунал" на сцэне тэатра імя Аляксандра Вянгеркі ў Беластоку. Гледачы вельмі цёпла прынялі спектакль. Размаўляючы на польскай мове, беларускі Цярэшка расказваў гледачам аб тых цяжкіх ваенных выпрабаваннях, што выпалі на долю беларускага народа. "Газета Беластоцка" адзначала, што спектакль стаў прыкметнай з'явай у тэатральным жыцці Беласточчыны.

На самых розных мовах народаў СССР – кіргізскай, узбекскай, украінскай, літоўскай, малдаўскай разыгрывалася гісторыя пра беларускага селяніна Цярэшку Калабка і яго сям'ю.

Ставілася п'еса і на сцэнах тэатраў Усходняй Еўропы: ГДР, Чэхаславакіі, ФРГ, Югаславіі, Іспаніі, Балгарыі.

З вялікім поспехам п'еса Андрэя Макаёнка "Трыбунал" ішла ў Тэатры драмы, оперы і балету ў горадзе Чэске-Будзеёвіцэ, горада-пабраціма Гомеля. Пастаноўку "Трыбунала" здзейснілі тэатры Сафіі, Варны, Тыргавіштэ.

Не страціла сваёй актуальнасці яна і зараз. Яе ставяць як прафесійныя, так і самадзейныя тэатры. Так, у 2005 годзе, да 60-годдзя Вялікай Перамогі п'еса "Трыбунал" была прадстаўлена на тэматычным Міжнародным фестывалі "Этот День Победы" ў Маскве. Рэжысёрам выступіў Валерый Анісенка, кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Пазней, з сумесным беларуска-рускім праектам – спектаклем "Трыбунал", ён жа ўдзельнічаў у прэстыжным Міжнародным тэатральным форуме "Залаты Віцязь".



А да 70-гадовага юбілею Вялікай Перамогі п'еса "Трыбунал" была пастаўлена Сяргеем Кулікоўскім на сталічных падмостках Новага драматычнага тэатра ў Мінску і многімі іншымі прафесійнымі і самадзейнымі тэатрамі Беларусі і Расіі.

Паводле "Трыбунала" Андрэй Макаёнак сумесна з пісьменнікам Артурам Вольскім напісалі лібрэта да аперэты

"Судны час" беларускага кампазітара Рыгора Суруса. Аперэта была пастаўлена ў Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі.

Дарэчы, п'еса Андрэя Ягоравіча Макаёнка "Трыбунал" у 1974 годзе была адзначана Дзяржаўнай прэміяй Беларусі імя Якуба Коласа (сумесна з п'есай "Таблетку пад язык"), паводле п'есы былі зняты дзве тэлеверсіі: у 1973 годзе – тэлеверсія спектакля Маскоўскага тэатра на Малой Броннай і у 1981 годзе – тэлеверсія спектакля Беларускага тэатра імя Янкі Купалы.

***Ніна Серыкава,***
*галоўны бібліятэкар аддзела краязнаўства*
*Гомельскай абласной бібліятэкі*